***А. Л. Лепяшынская,***
*лабарант*

# ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ У ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНЫМ МАСТАЦТВЕ БЕЛАРУСІ НА МЯЖЫ XX–XXI стст.

Народная культура з яе традыцыямі – гэта тое, што вызначае нашу адметнасць, сувязь з продкамі, з роднай зямлёй. Нашы дзяды зберaглі гэты скарб і перадалі яго нам, з ім мы жывём сёння. Побач з даследаваннем айчыннай культуры, захаваннем яе мы павінны перадаць лепшае са здабыткаў дзецям [2].

Але якім чынам пераканаць носьбітаў нашай будучыні, нашых нашчадкаў, паспрыяць таму, каб народная культура трансфармавалася ў элемент сучаснай культуры з захаваннем высокага грамадскага статусу?

Мы ўжо прызвычаіліся да высокага тэмпу жыцця. Паскарэнне рытму характэрна для сучаснасці. Інтэграцыя працэсаў развіцця эканоміка-культурнай сферы Беларусі адпавядае агульным працэсам глабалізацыі. Гэта пакідае ўсё менш магчымасцей для самаатаясамлівання, паглыблення ў сябе.

Этнакультура дазваляла індывідууму адчуваць сябе часткай агульнага працэсу, ладу жыцця, захоўваць уласныя адчуванні, неабходную здаровую самасць, непаўторнасць, адзінкавасць, што так важна для развіцця чалавека, а ў выніку і для развіцця ўзроўню культуры ўсёй краіны, агульнага ўзроўню грамадскага развіцця.

У наш час роля і месца народнага мастацтва ў жыцці грамадства прыкметна змяніліся, што выклікана сацыяльна-эканамічнымі перадумовамі. Перш за ўсё нельга не адзначыць, што бытавая, практычная функцыя народнага мастацтва губляе сваю асноўную рухальную ролю. Адыходзіць у нябыт калісьці вельмі істотная аснова народнай творчасці. Магчымасць набыць адзенне, прылады працы, посуд, упрыгожанні прамысловай вытворчасці здымае патрэбу ўласнаручна іх вырабляць. Аднак прамысловыя рэчы не заўсёды вызначаюцца тым узроўнем мастацкай насычанасці, які ўласцівы прадметам сялянскай творчасці. Таму народныя майстры і перайшлі да павышанай дэкаратыўнасці.

Нераўнамернасць гістарычнага працэсу вядзе да звужэння адных і пашырэння другіх, больш прагрэсіўных гаспадарча-культурных якасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, як і іншыя галіны народнай культуры, багатае і разнастайнае. За доўгі і складаны шлях развіцця яно выпрацавала мноства формаў, надзвычай багатыя разнастайныя і шматслойныя матывы, у большасці з якіх прасочваюцца шматвяковыя, а то і тысячагадовыя традыцыі [1]. На яго фарміраванне і развіццё наклалі адбітак розныя фактары: геаграфічны, гістарычны, сацыяльна-эканамічны і інш. У традыцыйным народным мастацтве беларусаў ярка, поўна і ўсебакова праявілася арыгінальная творчасць народа, яго этнічныя асаблівасці, эстэтычныя густы і светапогляд.

Агульнасць паходжання ўсходнеславянскіх народаў тлумачыць мноства падобных рыс у народным мастацтве беларусаў, рускіх і ўкраінцаў, асабліва ў яго старажытных формах. Нямала агульнага прасочваецца і з культурамі іншых суседніх і больш далёкіх народаў Еўропы. У той жа час у многіх відах беларускага народнага мастацтва заўважаюцца і адметныя рысы, якія тлумачацца этнічнымі асаблівасцямі, рознасцю прыродных умоў, а таксама нераўнамернасцю гістарычнага і эканамічнага развіцця.

Таму ў беларускім народным мастацтве арганічна спалучаюцца і старажытныя агульнаславянскія праявы, і больш познія дасягненні ўсходніх і заходніх суседзяў. Дзякуючы пераемнасці традыцый вобразы першабытных часоў мірна ўжываюцца з навейшымі, некаторыя старажытныя матывы, хоць і захоўваюцца, але нярэдка мадыфікуюцца да непазнавальнасці. Усе гэтыя абставіны вызначылі незлічоныя варыянты формаў вырабаў, матываў дэкору, асаблівасцей арнаменту, многія з якіх захаваліся да нашага часу, выкарыстоўваюцца ў сучасных формах і на мяжы XX–XXI стст.

Безумоўна, маштабы бытавання сучаснага народнага мастацтва ўжо далёка не ранейшыя. Калі ў мінулыя часы яно насычала сялянскі побыт з яго натуральным ці паўнатуральным укладам, было апраўдана неабходнасцю штодзённага карыстання, то сённяшнія карэнныя змены ў яго характары моцна звузілі сферу выкарыстання рукатворных прадметаў. Адпала практычная неабходнасць у іх вытворчасці, якая патрабуе шмат часу і творчых сіл майстра, улічваючы тое, што кожны выраб быў індывідуальны, адметны, таму можна лічыць аб’ектыўнай рэальнасцю тое, што некаторыя віды народнага мастацтва, звязаныя з ранейшым побытам, канчаткова адышлі ў нябыт.

Але сёння зноў назіраецца тэндэнцыя да пашырэння дыяпазону творчасці народных майстроў, мяняецца іх светапогляд. Сучаснаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народнаму мастацтву надаюцца новыя якасці, якія, з аднаго боку, сведчаць пра цесную сувязь са шматвяковай культурай народа, з другога – арганічна ўключаюцца ў дасягненні сучаснай культуры.

Народнае мастацтва нашага часу – складаная, неаднародная, шматаспектная з’ява, не заўсёды раўназначная творчасці ранейшых эпох, але жывая, пераменлівая, уплываючая на наша жыццё. Змяніліся яго функцыі, месца і роля ў жыцці грамадства, што не магло не паўплываць на яго характар. Народнае мастацтва мінулага вылучаецца сваёй цэласнасцю. На ўсіх этапах яго бытавання яму была ўласціва традыцыйнасць. Яна прасочваецца ў тэхналогіі, у форме сучасных вырабаў, іх арнаментыцы і каларыстыцы, што дазваляе адрозніваць сапраўднае народнае мастацтва ад самадзейнасці і імітацыі, асабліва ў сучаснай народнай творчасці. І ўсё ж неабходна прыкладаць асаблівае намаганне да захавання традыцыйных тэхналогій вырабаў, без гэтага традыцыі могуць адміраць. Так здарылася з некаторымі відамі вышыўкі, роспісу куфраў і дываноў, а таксама некаторых іншых відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Традыцыйныя тэхналогіі важна абнаўляць, распаўсюджваць, павышаць зацікаўленасць да іх у прадстаўнікоў новага пакалення. Развіццё традыцый народнага мастацтва, у тым ліку і тэхналагічных, – вынік калектыўнага вопыту і перадачы яго з пакалення ў пакаленне.

Сучаснаму народнаму мастацтву Беларусі ўласцівы паступовая страта бытавых, практычных функцый і адначасова рост дэкаратыўнай, мастацкай значнасці вырабаў, што, зрэшты, характэрна для народнага мастацтва і іншых краін. У сувязі з гэтым народнае мастацтва Беларусі, раней тыпова сельскае, арыентуецца сёння галоўным чынам на горад, адкуль ужо на новым узроўні зноў можа трапляць у вёску [3].

1. *Археалогія* і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: В. В. Гетаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 702 с.

2. *Літвінава, Ю.* Традыцыйныя рамёствы Беларусі : захаванне і развіццё / Ю. Літвінава. – Мінск : Студэнцкае этнаграфічнае таварыства, 2010. – 32 с.

3. *Сахута, Я.* Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / Я. Сахута. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Беларусь, 2001. – 110 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ